# Як выявіць кантэнт, што створаны ШІ або лічбава зменены

Даступныя і простыя для карыстання сістэмы ШІ дапамагаюць людзям вучыцца і ствараць кантэнт, аднак разам з тым для адкрытых грамадстваў і дэмакратый яны ўзмацняюць **рызыку распаўсюджвання дэз- і скажонай інфармацыі.** Важна перадухіліць захламленне нашых агульных інфармацыйных прастораў фальсіфікацыяй ды дэзынфармацыяй.

Частка рашэння — новыя тэхналогіі: софт ды ініцыятывы па выяўленні крыніцы кантэнту і фэйкаў. **Аднак тэхналагічныя рашэнні не дасканалыя, і, каб атрымаць агульнапрымальны набор правераных фактаў, грамадству патрэбная праца незалежных фактчэкераў.**

Вашай увазе кароткі агляд таго, што робяць незалежныя прафесійныя фактчэкеры, каб ідэнтыфікаваць ды абвергнуць створаную ШІ дэзынфармацыю ды фальсіфікацыю.

## Згенераваны ШІ кантэнт набірае папулярнасць

Сёння згенераваная ШІ няпраўда ды дэзынфармацыя займае невялікую долю ад усіх фэйкаў, якія даследуюць незалежныя прафесійныя фактчэкеры. А дыгітальна змененыя матэрыялы сустракаюцца ў працы фактчэкераў часцей.

Аднак: паводле ўнутранага апытання сяброў  Еўрапейскай сеткі фактчэкінгу, **большасць фактчэкераў прагназуе, што значэнне кантэнту, створанага ШІ, і дыгітальна змененых матэрыялаў будзе толькі расці**. Нядаўнія прыклады ў кантэксце Еўрапейскіх выбараў пацвярджаюць гэта.

**ТЛУМАЧЭННЕ:** *Дыгітальная (лічбавая) змена* — гэта значная трансфармацыя любога кантэнту, якую ажыццявілі з мэтай маніпуляцыі ці змены першапачатковага значэння, уключаючы рэдагаванне  інструментамі ШІ. Гэта не распаўсюджваецца на праўкі для паляпшэння зразумеласці ці якасці.

*"Створаны ШІ"* азначае любую форму кантэнту, што быў згенераваны сістэмамі штучнага інтэлекту.

Інфармацыю для вас падрыхтавала **AI@EUElections,** што фінансуецца Meta і знаходзіцца пад кіраўніцтвам **European Fact-Checking Standards Network** ва ўзаемадзеянні з яе сябрамі і знешнімі экспертамі.

## Тэхналогіі развіваюцца хутка, але разлічваць толькі на іх нельга.

Эксперты па ШІ і прафесійныя спецыялісты па праверцы фактаў сыходзяцца ў меркаванні: **адных інструментаў выяўлення штучнага інтэлекту недастаткова для выяўлення або развянчання кантэнту, створанага ШІ або зmененага ў лічбавым выглядзе.**

Перш чым выкарыстоўваць дэтэктар, эксперты рэкамендуюць пазнаёміцца з ШІ-генератарамі кантэнту і дэтэктарамі. З разуменнем таго, як трэніруюцца сістэмы, і крупляй статыстыкі, фактчэкеры могуць прадбачыць моцныя і слабыя бакі інструмента ды верагоднасць яго поспеху. **Тым не менш, дэтэктары могуць быць карысным стартавым пунктам.**

**Ініцыятывы па выяўленні крыніцы інфармацыі,** такія як C2PA Specifications, могуць дапамагчы пацвердзіць рэсурс і гісторыю медыя кантэнту. Але што датычыць вадзяных знакаў і верыфікацыі — яны не бездакорныя.

## Як дэзінфармацыя штучнага інтэлекту ўплывае на людзей

> “Кожны раз, як вы рэагуеце, калі так можна сказаць, сваімі паджылкамі, вы абмінаеце асабістую рэфлексію.”
> — Крысціна Дугуэн *

**ПСІХАЛОГІЯ:** Аперацыі па ўплыве часта маюць на мэце выкарыстанне кагнітыўных скажэнняў.

Асэнсаванне сябе і разуменне вашай аўдыторыі дапамагаюць супрацьстаяць дэзынфармацыі.

**МЭТЫ:** Чаму зламыснікі спадзяюцца на ШІ для стварэння або распаўсюджвання дэзынфармацыі? Якія мэты яны маюць у рэальным свеце?

- ➔ Пашырыць свой уплыў на іншую краіну або супольнасць?
- ➔ Праз шматлікія варыянты тоесных сцвярджэнняў перагрузіць фактчэкераў або перадухіліць выяўленне фэйкаў?
- ➔ Уплываць на думкі і перакананні аўдыторыі, усталёўваючы давер з дапамогай сеткі неаўтэнтычных акаўнтаў?
- ➔

**Крысціна Дугуэн — даследчыца ў галіне інфармацыйнага ўплыву ў Сарбоне.*

# Абвяржэнне патрабуе ўсебаковага падыходу ды разумення нюансаў

І калі інструменты выяўлення не працуюць, што ж дапамагае? Важна зразумець кантэкст сцвярджэння  настолькі ж глыбока, як і яго змест. Прафесійныя фактчэкеры экспертна валодаюць неабходнымі даследчымі навыкамі. І вось некаторыя парады.

> *“Інструменты выяўлення ніколі не будуць працаваць на ўсе 100%. Я і не чакаю, што некалі пачнуць.”*
> – Хэнк ван Эс**

**РАЗГЛЕДЗЬЦЕ КРЫНІЦУ:** Ці можаце вы пацвердзіць яе ідэнтычнасць? Пра што яна расказвае і што распаўсюджвае? Хто ўзаемадзейнічае з яе кантэнтам? Які ўплыў можа мець яе змест на чытачоў?

**ВЫСВЕТЛІЦЕ НАДЗЕЙНАСЦЬ:** Праверце інфармацыю незалежна з надзейных крыніц, такіх як эксперты з практычным досведам у дадзенай галіне. Ці мае распаўсюджаная інфармацыя сэнс, зыходзячы з вашага досведу?

Выкарыстоўвайце тэхнікі **МЕДЫЯКРЫМІНАЛІСТЫКІ,** каб узбагаціць традыцыйныя метады журналісцкіх і дакументальных расследаванняў. Напрыклад: скрэпінг дадзеных, геалакацыя, біяметрычнае распазнаванне, аналіз мадэляў і іншае.

**ВУЧЫЦЕСЯ ДЫ АДАПТУЙЦЕСЯ:** Стваральнікі згенераванай ШІ дэзінфармацыі ды фальсіфікацый увесь час адаптуюцца. Прыстасуйце свой падыход да зменлівага ландшафту.

**АБАГУЛЬНЯЙЦЕ СВАЮ ПРАЦУ**

Абвяржэнне няпраўдзівай інфармацыі эксперты рэкамендуюць суправаджаць празрыстым аналізам ды спасылкамі на крыніцы. Гэта можа дапамагчы чытачам прасачыць за ходам расследавання і зразумець нюансы наратыву.
У некаторых выпадках само расследаванне важнейшае за тое, створаны кантэнт ШІ ці не.

** Хэнк ван Эс — эксперт OSINT і тэхнік фактчэкінгу.

# Кароткі даведнік: Што можна, што нельга і падказкі

Далейшы спіс прыкмет дапаможа вызначыць, ці быў кантэнт створаны ШІ або лічбава рэдагаваны. Разам з іншымі парадамі, ўзгаданымі ў гэтым гайдзе — кантэкст, метады даследавання і інструменты выкрыцця, — гэта дасць вам зразуменне праўды па-за тым, што падаецца на першы погляд.

## Тэкст

- ➔Часта (але не заўсёды) мае **лепшую граматыку**, чым чалавек..
- ➔Часцей будуць выкарыстоўваць **занадта фармальную або структурызаваную мову**, асабліва ў сацыяльных медыя.
- ➔**Празмерная колькасць прыслоўяў або прыметнікаў.**
- ➔Адсутнасць чалавечых эмоцый, гумару, іроніі ды ідыяматычных выразаў..
- ➔Можа быць **дэфіцыт канкрэтных дэталяў** (імёнаў, дат, лакацый) або арыгінальных ідэй.
- ➔Найважнейшае: ці з'яўляюцца выказаныя ў тэксце словы праўдзівымі фактамі?

## Відэа

- ➔Не ўжывайце дэтэктар выяваў, згенераваных ШІ, у дачыненні да відэа-кадраў.
- ➔Назірайце **за выразамі твару і рухамі,** напрыклад, за міргannем, або ці супадае рух вуснаў з маўленнем.
- ➔Відэа можа мець адметнасці ў выглядзе **рэзкіх пераходаў ці нечаканай абрэзкі.**

## Аўдыё

- ➔**Параўнайце аўдыё,** якое выклікае падазрэнні, **з аўтэнтычным узорам,** выкарыстоўваючы інструменты, якія могуць выяўляць адрозненні ў маўленні, дыханні, інтанацыі...
- ➔Пры выкарыстанні дэтэктараў пазбягайце нізкаякасных аўдыё са статычным або фонавым шумам.
- ➔Могуць быць мець адметныя **ненатуральныя або механічныя маўленчыя патэрны**, недахоп паўз ці жывога дыхання.

## Выявы

- ➔Шукайце **штучныя дэталі:** ідэальная скура, размыты фон, ненатуральная прыгажосць ці святло, а таксама дзівацтвы, напрыклад, дадатковыя пальцы.
- ➔**Пашукайце вадзяны знак** распаўсюджаных ШІ-генератараў выяваў.
- ➔Звяртайце ўвагу на дэталі таго, што паказана на выяве: ці гэта лагічна? Ці гэта дарэчна?
- ➔Пры выкарыстанні дэтэктараў **аддавайце перавагу версіі выявы з высокім дазволам якасці ці больш ранняй загрузкі, а не той, якую некалькі разоў** перазалілі.